Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт музычнага мастацтва
Кафедра мастацтва эстрады

УЗГОДНЕНА
Загадчыка кафедрай

_______________А.В. Шэдава
«___»__________________20___г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

_______________І.М. Грамовіч
«___»__________________20___г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**ПАДРЫХТОЎКА АНСАМБЛЕВЫХ
І АРКЕСТРАВЫХ ПАРТЫТУР**

для спецыяльнасці
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),
напрамка спецыяльнасці: 1-17 03 01-02
Мастацтва эстрады (камп’ютарная музыка)*

Складальнік:
Горын С.Г., старшы выкладчык кафедры мастацтва эстрады

Разгледжана і узгоднена
на паседжанні савета УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 4 ад 19.12. 2017 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*С.Г. Горын*, старшы выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В.В.Бартноўскі*, прафесар духавой кафедры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”;
*А.І. Ахвердава*, загадчык кафедры мастацкай творчасці і прадзюсарства прыватнай ўстановы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацверджэння:**

*кафедрай* мастацтва эстрады установы адукацыі Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў (пратакол № 4 ад 22.11.2017 г.)
*саветам* факультэта музычнага мастацтва установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 27.11.2017 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………………... | 4 |
| 2. | ТЭАРЫТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………… | 6 |
| 2.1 | Вучэбныя пасобія, навучальныя дапаможнікі………………....... | 6 |
| 2.2 | Змест аўдыторнай работы студэнтаў: тэарытычная частка…… | 6 |
| 2.3 | Відэа- і аўдыёматэрыялы……………………………..….....….. | 8 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………… | 10 |
| 3.1 | Практыкум……………………………………………………….. | 10 |
| 3.2 | Апісанне практычных работ……………………………………. | 11 |
| 3.3 | Тэматыка практычных заняткаў……………………………….. | 11 |
| 3.4 | Змест аудыторнай работы студэнтаў: практычная частка ..….. | 12 |
| 3.5 | Спіс пытанняў па тэмах практычных заняткаў ……………… | 12 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ…………………………….. | 14 |
| 4.1 | Заданні для самастойнай работы студэнтаў………………… | 14 |
| 4.2 | Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў ………………………..…………………… | 15 |
| 4.3 | Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі…………… | 15 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………… | 19 |
| 5.1 | Вучэбная праграма …………………………………………… | 19 |
| 5.2 | Асноўная літаратура …………………………………………….. | 31 |
| 5.3 | Дадатковая літаратура ………………………………………… | 31 |
| 5.4 | Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны…………... | 36 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне "Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур" распрацаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай і адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках): 1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка) для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У дадзеным ВМК аб'ядноўваюцца і сістэматызуюцца структурныя элементы навукова-метадычнага забеспячэння выкладання вучэбнай дысцыпліны "Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур".

***Галоўная мэта ВМК*** – тэарытычнае і практычнае забеспячэнне атрымання студэнтамі прафесійнай адукацыі ў галіне падрыхтоўкі партытур для розных складаў эстрадных ансамбляў і аркестраў, адаптацыі аранжыровак і пералажэнняў музычных твораў для дадзеных складаў музычных калектываў, практычнае азнаямленне з творчымі калектывамі краіны і іх асаблівасцямі, паступовае павышэнне якасці дадзенай галіны адукацыі, а таксама выкарыстанне лепшага сусветнага вопыта выкладання вучэбнай дысцыпліны "Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур", заснаванага на выніках практыкі выкладання і навуковых даследванняў у гэтай галіне адукацыі.

***Галоўнымі задачамі ВМК*** з'яўляюцца:

- вызначэнне асаблівасцей выкладання вучэбнай дысцыпліны "Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур" для студэнтаў ВНУ,
- дапамога студэнту і выкладчыку ў пашырэнні ведаў аб інструментарыі сучасных беларускіх і сусветных эстрадных ансамбляў і аркестраў з мэтай выкарыстання сродкаў выразнасці груп музычных інструментаў і вакальных гуртоў пры падрыхтоўцы партытур для іх далейшага выканання ў дадзеных складах эстрадных ансамбляў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аркестраў, аб узаемасувязі і ўзаемазаменнасці музычных інструментаў і аркестравых груп, аб аркестрацечнасці;

- пашырэнне ведаў студэнта аб тыповых складах традыцыйных і сучасных эстрадных ансамбляў, біг-бэнда і эстрадна-сімфанічных аркестраў, у тым ліку якія існуюць і займаюцца музычнай творчасцю у Рэспубліцы Беларусь, іх асноўныя склады, рысы і асаблівасці,

- ажыццяўленне цеснай сувязі вучэбнай дысцыпліны з творчай практыкай і канцэртным жыццём універсітэта і краіны;

- сістэматызацыя прынцыпаў навучання студэнтаў у межах вучэбнай дысцыпліны “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур”,

- практычная падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур для іх выканання канцэртнымі эстраднымі ансамблямі і аркестрамі розных складаў.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” складаецца з 5 раздзелаў, ВМК уключае ў сябе тэарытычныя і практычныя раздзелы, раздзел кантролю ведаў и дапаможны раздзел, а таксама тлумачальную запіску.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” распрацаваны для студэнтаў усіх курсаў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў для забеспячэння працэса падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне аранжыроўкі для эстрадных ансамбляў і аркестраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЫТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

2.1. Рэкамендуемыя вучэбныя дапаможнікі для тэарытычнага вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай і адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках):

1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка), для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь:

1. *Браславский, Д. А.* Аранжировка для эстрадных ансамблей и оркестров / Д. А. Браславский. – М. : Музыка, 1974. – 392 с.
2. *Гаранян, Г. А.* Аранжировка для эстрадных и вокально-инструментальных ансамблей / Г. А. Гаранян. – М. : Музыка, 1986. – 224 с.
3. *Гаранян, Г. А.* Основы эстрадной и джазовой аранжировки / Г. А. Гаранян. – М. : Фонд Георгия Гараняна, 2010. – 252 с.

У сувязі з адсутнасцю спецыялізаваных вучэбных дапаможнікаў па вучэбнай дысцыпліне "Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур" і з тым, што навучанне па дадзенай дысцыпліне грунтуецца большай часткай на практычных ведах выкладчыкаў дысцыпліны і на вопыце выканання студэнтам творчых работ, часцей за ўсе, для самападрыхтоўкі і тэарытычнага вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай і адукацыйным стандартам студэнты павінны выкарыстовываць вучэбныя дапаможнікі па аранжыроўцы і інструментоўцы для эстрадных ансамбляў і аркестраў.

## 2.2 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: тэарытычная частка

Сучасная практыка ансамблевага і аркестравага выканальніцтва налічвае вялікую колькасць жанравых і стылістычных напрамкаў у музыцы, што патрабуе ад кампазітара і аранжыроўшчыка высокага прафесіяналізма, а таксама здольнасцяў да творчай дзейнасці. У тэарытычнай частке ВМК на практычных занятках студэнты азнаямляюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- з інструментарыем традыцыйных і сучасных эстрадных ансамбляў і аркестраў, тэхнічнымі і выразнымі магчымасцямі іх музычных інструментаў і аркестравых груп, а таксама з выразнымі магчымасцямі салістаў-вакалістаў і вакальных груп,
- з неабходнай тэрміналогіяй, якая выкарыстовываецца ў эстрадна-джазавай музыцы,
- з асаблівасцямі эстрадных стылей і жанраў, якія часцей за ўсё выкарыстоўваюцца ў ансамблевам і аркестравам выканальніцтве, а таксама з прыкладамі найбольш прафесійных узораў напісання партытур эстрадных п’ес розных стылевых напрамкаў і іх гучання ў эстрадных ансамблях і аркестрах,
- з работай над музычнай формай аркестровага твору, з асаблівасцямі розных музычных форм аркестравых твораў,
- з асноўнымі метадамі работы над транскыпцыямі музычных твораў, методыкай прафесійнага “з’ёму” з аудыё- ці відэёзапісу,
- з метадамі самастойнай працы над партытурай музычнага твора, з практычнымі і вучэбнымі дапаможнікамі.

Праца над эстрадным і джазавым рэпертуарам дадае да аранжыроўшчыка шэраг спецыфічных задач, многія з якіх павінны вырашацца ў комплексе з выкарыстаннем тэарытычных ведаў і практычных навыкаў, атрыманых у межах вывучэння такіх вучэбных дысцыплін, як «Аранжыроўка і пералажэнне музычных твораў», «Спец-інструмент», «Чытанне і аналіз ансамблевых і аркестравых партытур», «Камп’ютарная аранжыроўка», «Тэорыя музыкі», «Сучасныя стылі джазавай музыкі», «Джазавыя стандарты», «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза» і іншых.

Тэхнічнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” для студэнтаў кафедры мастацтва эстрады мяркуе налічнасць камп’ютара з неабходнымі тэхнічнымі магчымасцямі, сучаснага музычнага праграмнага абсталявання да яго,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мідзі-клавіятуры, электронага клавішнага інструмента ці піяніна, а таксама гукаўзмацняючай апаратуры.

Выкарыстанне на аўдыторных і самастойных занятках апаратуры і электраабсталявання мяркуе у студэнта налічнасць ведаў аб правілах работы з імі, а таксама правіл тэхнікі бяспекі. Перад пачаткам вучэбнага года інструктаж студэнтаў па тэхніцы бяспекі абавязковы.

Для паспяховага навучання і работы студэнта над партытурай немалаважным з’яўляецца складанне выкладчыкам творчай атмасферы на аўдыторных занятках, подахвочванне студэнта да музычных эксперыментаў, а таксама вялікае значэнне мае паразуменне між студентамі і выкладчыкам.

Навучанне ў межах курса вучэбнай дысцыпліны “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” праводзіцца ў складзе вучэбных груп на практычных занятках на працягу 6 семестраў. Група састаіць са студэнтаў аднаго курса, якія вывучаюць дысцыпліну ў вучэбнай аўдыторыі з неабходным абсталяваннем. На самападрыхтоўцы студэнты выконваюць практычныя заданні, якія правяраюцца на аўдыторных занятках у складзе групы. Тым самым, студэнты на практыцы паступова вучацца асаблівасцям сучаснай падрыхтоўкі ансамблевых і аркестравых партытур.

### 2.3 Відэа- і аўдыёматэрыялы

У мэтах забеспячэння вучэбнага працэса пры напісанні студэнтам партытуры музычнага твора рэкамендуецца выкарыстоўваць розныя відэа- і аудыёматэрыялы па гэтай тэматыцы, у тым ліку, і з сеціва Інтэрнэт. Гэта пашырыць веды студэнта аб рэальных саставах творчых калектываў, асаблівасцях іх гучання, і будзе спрыяць паступоваму павышэнню якасці адукацыі ў галіне падрыхтоўцы ансамблевых і аркестравых партытур, а таксама дазволіць тэорыю вучэбнай дысцыпліны цесна ўзаемазвязаць з практыкай. Таксама з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходным выкарыстанне студэнтам і выкладчыкам лепшага сусветнага вопыта па тэме “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур”, заснаванага на выніках навуковых даследванняў у гэтай галіне мастацкай творчасці. Аднак студэнт і выкладчык абавязаны, выкарыстоўваючы лепшы вопыт сусветных творчых калектываў, імкнуцца ўнесці ў яго свае нацыянальныя беларускія рысы, дамагчыся новага гучання аркестра ці ансамбля, а таксама новых незвычайных транскрыпцый, унесці свой унёсак у развіццё дысцыпліны і беларускай музычнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Практыкум

Напісанне і падрыхтоўка партытур па дадзеных тэмах:

- канцэртная п’еса для эстраднага ансамбля на тэму беларускай народнай песні ці тэму песні беларускага кампазітара,
- музычная п’еса уласнага напісання (складання) для эстраднага ансамбля,
- музычная п’еса для эстраднага ансамбля ў стыле “лаціна”,
- музычная п’еса для эстраднага ансамбля ў стыле “фанк”,
- музычная п’еса для эстраднага ансамбля ў стыле “фьюжн”,
- музычная п’еса для эстраднага ансамбля на тэму вызначанага джазавага стандарта,
- музычная п’еса на тэму вызначанага джазавага стандарта для няпоўнага склада біг-бэнда, эстраднага аркестра,
- канцэртная п’еса з папулярнага кінафільму (саундтрэк) для эстрадна-сімфанічнага аркестра,
- папуры (фантазія) на тэмы вызначаных песень для эстрадна-сімфанічнага аркестра,
- здым з аудыёзапісу музычнай п’есы для эстрадна-сімфанічнага аркестра,
- канцэртная аркестравая музычная кампазіцыя уласнага напісання (складання) для эстрадна-сімфанічнага аркестра,
- адаптацыя музычнага твора для вучэбнага эстрадна-сімфанічнага аркестра кафедры мастацтва эстрады,
- напісанне партытуры папулярнай песні для эстрадна-сімфанічнага аркестра,
- напісанне партытуры апрацоўкі папулярнай мелодыі для эстрадна-сімфанічнага аркестра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.2. Апісанне практычных работ

У межах вывучэння дысцыпліны “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” прадугледжана абавязковае стварэнне шэрагу аркестравых і ансамблевых партытур у музычным рэдактары “Сібеліус”, у якіх студэнт на практыцы фіксуе вынік засваення і творчага выкарыстання пройдзенага матэрыялу. На тэхнічным заліку, заліку ці экзамене ацэньваецца якасць выкананых практычных творчых работ.

### 3.3 Тэматыка практычных заняткаў:

1. Адаптацыя музычнага твора для вызначанага склада эстрадна-сімфанічнага аркестра;

2. Асаблівасці “здыма” (транскрыпцыі) музычнага твора з аудыёфанаграмы ці відэазапісу;

3. Асаблівасці напісання акампанементу для вызначанага склада эстрадна-сімфанічнага аркестра;

4. Асаблівасці гучання і пытанні балансу ў сучаснам эстрадна-сімфанічнам аркестры;

5. Асаблівасці перапрацоўкі фартэпіяннай фактуры ў ансамблевую ці аркестравую для вызначанага склада эстраднага ансамбля ці эстрадна-сімфанічнага аркестра;

6. Віды эстрадных ансамбляў і іх асаблівасці;

7. Асноўныя прынцыпы аркестравай кампазіцыі, напісання уласных ансамблевых ці аркестравых п’ес;

8. Разнавіднасці стыляў і стылявых напрамкаў у эстраднай музыцы, іх спалучэнні і кантрасты;

9. Асаблівасці напісання партытур для сучаснага біг-бэнда;

10. Асаблівасці аранжыроўкі акампанементу для эстрадна-сімфанічнага аркестра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.4 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: практычная частка

- вучэбны матэрыял для напісання ў межах вучэбнай дысціпліны падбіраецца па прынцыпу ад простага да складанага з улікам індывідуальных здольнасцей студэнтаў. Таксама ўлічваецца неабходнасць аранжыроўкі гэтай дадзенай работы для выканання у Маладзёжным эстрадна-сімфанічным аркестры універсітэту,
- для падрыхтоўкі прафесійных рознабаковых спецыялістаў выкладчык павінен падбіраць творы розных стылей, напрамкаў і жанраў, у тым ліку творы беларускіх кампазітараў,
- вынікам навучання студэнта тэмам праграмы з'яўляецца падрыхтоўка на залік ці экзамен прафесійнай партытуры па дадзенай тэме для выканання у эстрадным ансамбле ці аркестры, пры гэтым студэнт абавязаны указаць тэмп, штрыхі, дынаміку, фразіроўку і г.д. для усіх музычных інструментаў.

### 3.5 Змест пытанняў по темах практычных заняткаў

- тэорыя і практыка напісання партытуры папулярнай песні для эстраднага ансамбля,
- тэорыя і практыка напісання партытуры папулярнай песні для эстрадна-сімфанічніга аркестра,
- тэорыя і практыка напісання партытуры апрацоўкі папулярная мелодыі для эстраднага ансамбля,
- тэорыя і практыка напісання партытуры апрацоўкі папулярнай мелодыі для эстрадна-сімфанічніга аркестра,
- тэорыя і практыка напісання партытуры джазавага стандарту для эстраднага ансамбля,
- тэорыя і практыка “здыма” (транскрыпцыі) з аудыёзапісу для эстраднага ансамбля,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- тэорыя і практыка “здыма” (транскрыпцыі) з аудыёзапісу канцэртнай п’есы у выкананні эстрадна-сімфанічніга аркестра для іншага складу аркестра,
- тэорыя і практыка напісання партытуры ансамблевага і аркестравага акампанементу для саліста-вакаліста ці саліста-інструменталіста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

На залік па вучэбнай дысцыпліне “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” студэнт абавязаны прадставіць 3-4 партытуры ў паўгоддзе (на 2 курсе - для эстрадных ансамбляў, на 3-4 курсах – для сярэдняга ці вялікага складаў эстрадна-сімфанічнага аркестра). Студэнт павінен таксама прадэманстраваць здольнасці да аналізу сваёй партытуры;

На экзамен па вучэбнай дысцыпліне “Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур” студэнт абавязаны прадставіць 3-4 партытуры ў паўгоддзе (на 2 курсе - для эстрадных ансамбляў ці аркестраў, на 3-4 курсах – для сярэдняга ці вялікага складаў эстрадна-сімфанічнага аркестра). Студэнт павінен прадэманстраваць веды тэарэтычнага матэрыялу па усім тэмам курсу, здольнасці да аналізу сваёй партытуры.

## 4.1 Заданні для самостойнай работы студэнтаў

Праверка 3-4 партытур за паўгоддзе па тэмах:

- падрыхтоўка партытуры канцэртнай п’есы для выканання ў эстрадным ансамблі,
- падрыхтоўка партытуры канцэртнай п’есы для выканання ў эстрадна-сімфанічным аркестры,
- адаптацыя партытуры для выканання ў эстрадна-сімфанічным аркестры,
- напісанне ўласнай канцэртнай кампазіцыі для эстраднага ансамбля і аркестра,
- напісанне папуры на тэмы некалькіх песень для выканання ў эстрадна-сімфанічным аркестры.
- аранжыроўка для эстрадна-сімфанічнага аркестра,
- перамалажэнне музычнага твора для эстрадна-сімфанічнага аркестра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў абапіраецца на асноўныя формы:

- самастойные заняткі над партытурай музычнага твора (вызначэнне танальнасці, размера, тэмпа, дынамікі и г.д.; стварэнне музычнай формы твора, работа над іншым вучебным матэрыялам);
- работа над аудыё- ці відэа- запісамі, праслухоўванне і іх аналіз,
- аналіз творчастці і розных музычных твораў вядучых сусветных кампазітараў і аранжыроўшчыкаў, вызначэнне прыёмаў іх пісьма,
- аналіз музычных форм і музычных твораў,
- прагляд відэаматэрыялаў вызначаных музычных твораў і канцэртаў у выкананні вядучых сусветных эстрадных ансамбляў і аркестраў,
- наведванне канцэртаў джазавой і эстраднай музыкі, у том ліку беларускіх выканаўцаў.

Самастойная праца студэнтаў павінна правадзіцца паслядоўна і планамерна на працягу ўсяго курса навучання. Самастойныя заданні выконваюцца студэнтам штотыднёва на самападрыхтоўцы, заданні павінны улічваць узровень ведаў студэнта і яго творчыя магчымасці. Педагагічны кантроль ажыццяўляецца на практычных занятках, дзе самастойная работа правяраецца и ацэньваецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

1. вуснае апытанне па тэмах;
2. творчыя заданні па падрыхтоўцы партытур музычных твораў для вызначанага складу эстраднага ансамбля і эстрадна-сімфанічніга аркестра;
3. творчыя заданні па кампазіцыі ўласнай канцэртнай п’есы для

вызначанага складу эстраднага ансамбля і для эстрадна-сімфанічніга аркестра;

4. правядзенне кантрольнага занятка;
5. правядзенне тэхнічнага заліка
6. залік;
7. экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

**10 балаў** ставіцца за дасканалае выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», бездакорны ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы, выдатны ўзровень культуры выканання творчых заданняў;

**9 балаў** ставіцца за выдатнае выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за высокі ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, высокі ўзровень культуры выканання творчых заданняў;

**8 балаў** ставіцца за добрае выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за дастатковы ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, сістэматызаваныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, добры ўзровень культуры выканання заданняў;

**7 балаў** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на сярэднім мастацкім узроўні, за дастатковы ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за сістэматызаваныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, добры ўзровень культуры выканання заданняў;

**6 балаў** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на здавальняючым мастацкім узроўні, за дастатковы ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за дастатковыя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў;

**5 балаў** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на здавальняючым мастацкім узроўні, за слабы ўзровень валодання арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за недастатковыя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, сярэдні ўзровень культуры выканання заданняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**4 балы** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на нізкім мастацкім узроўні, за слабы ўзровень валодання арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за недастатковыя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, сярэдні ўзровень культуры выканання заданняў, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

**3 балы** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на нізкім мастацкім узроўні, за нізкі ўзровень валодання арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за недастатковыя веды па пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў;

**2 балы** ставіцца за недастатковую колькасць патрабуемых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за фрагментарныя веды па пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў;

**1 бал** ставіцца за адсутнасць патрабуемых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за адмову ад адказу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## Вучэбная праграма

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«____»______________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/баз.

# ПАДРЫХТОЎКА АНСАМБЛЕВЫХ І АРКЕСТРАВЫХ ПАРТЫТУР

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-02*
*Мастацтва эстрады (камп’ютарная музыка)*

Мінск
БДУКМ
2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*К. П. Станкевіч,* выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*С. Г. Горын*, старшы выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*У. М. Каральчук*, дацэнт кафедры інструментоўкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;

*А. Л. Карацееў*, прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 19.05.2014 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказныя за выпуск: К. П. Станкевіч, С. Г. Горын

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» дазваляе навучыцца адаптаваць партытуры для розных складаў эстрадных ансамбляў і аркестраў, а таксама ствараць транскрыпцыі музычных фанаграм для выканання ў эстрадных ансамблях і эстрадна-сімфанічным аркестры. Яна цесна ўзаемазвязана з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як «Аранжыроўка і пералажэнне музычных твораў», «Спецінструмент», «Чытанне і аналіз ансамблевых і аркестравых партытур», «Камп’ютарная аранжыроўка», «Тэорыя музыкі».

У межах дадзенай дысцыпліны студэнты павінны навучыцца ствараць, адаптаваць і падрыхтоўваць для выканання партытуры, якія ў далейшым будуць агучаны ў эстрадных ансамблях і эстрадна-сімфанічным аркестры. Гэтая акалічнасць мае вялікае значэнне для развіцця іх унутранага тэмбравага аркестравага слыху і мыслення.

*Галоўная мэта* вучэбнай дысцыпліны – набыць устойлівыя ўменні і навыкі па падрыхтоўцы партытур для выканання ў эстрадных ансамблях і эстрадна-сімфанічным аркестры.

*Галоўнымі задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– пашырэнне ведаў аб музычных інструментах эстрадных ансамбляў і эстрадна-сімфанічнага аркестра з мэтай выкарыстання іх сродкаў выразнасці пры падрыхтоўцы ансамблевых і аркестравых партытур;

– засваенне асаблівасцей адаптавання ансамблевых і аркестравых партытур для непасрэднага выканання ў эстрадных ансамблях і эстрадна-сімфанічным аркестры;

– засваенне асаблівасцей адаптавання музычных фанаграм для непасрэднага выканання ў эстрадных ансамблях і эстрадна-сімфанічным аркестры;

– развіццё ўнутранага тэмбравага слыху і аркестравага мыслення.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя прынцыпы стварэння партытур для эстрадных ансамбляў і эстрадна-сімфанічнага аркестра, акустычныя і мастацкія магчымасці ўсіх музычных інструментаў і прылад, якія выкарыстоўваюцца ў ансамблях і аркестры;

– прынцыпы пабудовы акордавай, гамафонна-гарманічнай і поліфанічнай фактуры эстрадна-сімфанічнага аркестра;

*умець:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстоўваць асноўныя прынцыпы аранжыроўкі і пералажэння музычных твораў для эстрадных ансамбляў і эстрадна-сімфанічнага аркестра на прафесійным узроўні;

– арыентавацца ў стылявых напрамках сучаснай музычнай культуры, а таксама выкарыстоўваць асаблівасці музычных стыляў і жанраў у аранжыроўках твораў беларускіх і замежных кампазітараў;

– выкарыстоўваць музычныя формы розных жанраў джазавай, рок- і поп-музыкі;

– самастойна працаваць над творам у працэсе стварэння аранжыроўкі;

*валодаць:*

– прынцыпамі стварэння партытуры для эстрадных ансамбляў і аркестраў розных складаў;

– стылістычнымі прыёмамі стварэння аранжыровак музычных твораў розных жанраў і форм джазавай, рок- і поп-музыкі.

У межах вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» прадугледжана абавязковае стварэнне студэнтамі ансамблевых і аркестравых партытур, якія агучваюцца ў канцэртных праграмах ансамбляў кафедры мастацтва эстрады і Маладзёжнага эстрадна-сімфанічнага аркестра.

Пры выкладанні дадзенай дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя тэхналогіі навучання: інфармацыйныя, эўрыстычныя, эмацыянальна-мастацкія, асабова-арыентацыйныя, творчыя, камп’ютарнае навучанне.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» усяго адведзена 404 гадзіны, з якіх 216 гадзін – аўдыторныя (практычныя) заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных (практычных) гадзін |
|---|---|
| **Уводзіны** | 2 |
| **Раздзел I. Асаблівасці стварэння транскрыпцый для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра** | |
| *Тэма 1.* Асаблівасці гучання ансамбля, аркестра ў параўнанні з камп’ютарнай фанаграмай | 2 |
| *Тэма 2.* Асаблівасці транскрыпцыі з музычнай фанаграмы. Замена музычных інструментаў пры транскрыпцыі ў адпаведнасці з кампазітарскім замыслам | 12 |
| *Тэма 3.* Асаблівасці транскрыпцыі партый ударнай установкі і перкусіі. Асаблівасці транскрыпцыі і пераапрацоўкі электронных ударных інструментаў для ўдарнай установкі і перкусіі | 12 |
| *Тэма 4.* Асаблівасці транскрыпцыі партыі фартэпіяна, гітары, бас-гітары і інш. Пераасэнсаванне і ўвядзенне ў партытуру партый музычных інструментаў | 14 |
| **Раздзел II. Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычных твораў з розных саставаў ансамбляў і аркестраў для дадзенага складу эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра** | |
| *Тэма 5.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры эстраднага ансамбля для дадзенага (іншага) складу эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра | 12 |
| *Тэма 6.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры сімфанічнага аркестра для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра | 14 |
| *Тэма 7.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры духавога аркестра для эстрадна-сімфанічнага аркестра | 14 |
| *Тэма 8.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры ансамбля (аркестра) некласічнага складу для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра | 14 |
| **Раздзел III. Асаблівасці работы над формай музычнага твора і падрыхтоўкі партытуры эстраднай канцэртнай мініяцюры для выканання ў эстрадна-сімфанічным аркестры** | |
| *Тэма 9.* Скарачэнне асобных частак музычнага твора | 10 |
| *Тэма 10.* Дабаўленне новых раздзелаў у музычны твор. | 14 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Асаблівасці работы над распрацоўкай музычнага матэрыялу | |
| *Тэма 11.* Асаблівасці чаргавання і спалучэння аркестравых эпізодаў | 14 |
| *Тэма 12.* Асаблівасці падрыхтоўкі аркестравых партый | 16 |
| **Раздзел IV. Падрыхтоўка партытуры для салістаў-інструменталістаў (ансамбля салістаў), салістаў-вакалістаў і эстрадна-сімфанічнага аркестра** | |
| *Тэма 13.* Асаблівасці падрыхтоўкі партыі саліста-інструменталіста | 16 |
| *Тэма 14.* Асаблівасці падрыхтоўкі партый для ансамбля салістаў-інструменталістаў | 16 |
| *Тэма 15.* Асаблівасці падрыхтоўкі партыі салістаў-вакалістаў | 16 |
| *Тэма 16.* Асаблівасці напісання партыі бэк-вакалу | 18 |
| **Усяго…** | **216** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Узаемасувязь дысцыпліны «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» з вучэбнымі дысцыплінамі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны. Адпаведнасць створанай аранжыроўшчыкам аркестравай партытуры рэальнаму складу эстраднага ансамбля і аркестра. Тыпы і віды эстрадных ансамбляў. Малыя, сярэднія, вялікія склады эстрадна-сімфанічнага аркестра. Адаптацыя ансамблевай і аркестравай партытуры па складанасці да тэхнічнага ўзроўню выканаўцаў ансамбля ці аркестра.

## Раздзел I. Асаблівасці стварэння транскрыпцый для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра

### *Тэма 1. Асаблівасці гучання ансамбля, аркестра ў параўнанні з камп'ютарнай фанаграмай*

Асаблівасці гучання духавых, струнных і інструментаў рытм-секцыі ў рэпетыцыйным працэсе і на канцэртнай пляцоўцы. Адпаведнасць балансу паміж рознымі групамі аркестра. Спалучэнне тэмбраў у ансамблевай і аркестравай вертыкалі. Улік дынамічных асаблівасцей інструментаў у агульным гучанні. Дынамічны баланс у рэальным ансамблі, аркестры і ў камп'ютарнай фанаграме.

### *Тэма 2. Асаблівасці транскрыпцыі з музычнай фанаграмы. Замена музычных інструментаў пры транскрыпцыі ў адпаведнасці з кампазітарскім замыслам*

«Здым» (транскрыпцыя) музычнага твора з фанаграмы без наяўнасці нотнага тэксту, яго асаблівасці. Стварэнне, «вылічэнне» ансамблевай, аркестравай гармоніі і перагарманізацыя музычнага матэрыялу. Адаптацыя фанаграмы да розных складаў ансамбляў, а таксама эстрадна-сімфанічнага аркестра. Саўнд (гучанне) ансамбляў, аркестраў і эстрадных груп, магчымасць перадачы іх сродкамі рэальнага эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра ў канцэртных умовах. Адпаведнасць і ўзаемазамяняльнасць музычных інструментаў ан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самбля, аркестра. Улік кампазітарскага замыслу пры замене музычных інструментаў.

*Тэма 3. Асаблівасці транскрыпцыі партый ударнай устаноўкі і перкусіі. Асаблівасці транскрыпцыі і пераапрацоўкі электронных ударных інструментаў для ўдарнай устаноўкі і перкусіі*

Партыя вялікага барабана і яе сувязь з лініяй бас-гітары, іх слыхавая дыферэнцыяцыя з мэтай найбольш дакладнай транскрыпцыі партыі ўдарнай устаноўкі. Адметныя рысы тэмбравага гучання камбінацый інструментаў ударнай устаноўкі (адначасовае гучанне вялікага і малога барабана, вялікага барабана і томаў, малога барабана і томаў). Дадатковы ўвод некаторых інструментаў ударнай устаноўкі з мэтай падтрымкі рытму музычнага твора. Спрашчэнне партыі ўдарных інструментаў пры транскрыпцыі. Стварэнне рытмічнай формулы ўдарнай устаноўкі з улікам асаблівасці стыляў. Транскрыпцыя і адаптацыя партыі электронных ударных інструментаў да выканання ў эстрадна-сімфанічным аркестры. Замена тэмбраў электронных ударных інструментаў тэмбрамі інструментаў ударнай устаноўкі, блізкімі па гучанні.

*Тэма 4. Асаблівасці транскрыпцыі партыі фартэпіяна, гітары, бас-гітары і інш. Пераасэнсаванне і ўвядзенне ў партытуру партый музычных інструментаў*

Рытмічная формула акампанементу. Неабходнасць дасачынення фрагментаў партый фартэпіяна, гітары, бас-гітары і іншых музычных інструментаў, якія эпізадычна праслухоўваюцца ў партытуры. Слыхавая дыферэнцыяцыя тэмбру клавішных інструментаў (фартэпіяна). Слыхавая дыферэнцыяцыя тэмбру гітары. Слыхавая дыферэнцыяцыя тэмбраў духавых, струнных і іншых музычных інструментаў. Пераасэнсаванне партый музычных інструментаў з фанаграмы, у тым ліку электронных, якія адсутнічаюць у аркестры, з мэтай прыстасаваць іх да выканання іншымі інструментамі. Увядзенне ў партытуру партый інструментаў, якія адсутнічаюць у фанаграме.

## Раздзел II. Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычных твораў з розных саставаў ансамбляў і аркестраў для дадзенага складу эстраднага ансамбля,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**эстрадна-сімфанічнага аркестра**

*Тэма 5. Асаблівасці адаптацыі і пераладжэння музычнага твора з партытуры эстраднага ансамбля для дадзенага (іншага) складу эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра*

Пераасэнсаванне партый музычных інструментаў эстраднага ансамбля ў адпаведнасці з дадзеным складам эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра. Дабаўленне фактурных элементаў, стварэнне кантрапунктаў на аснове гарманічных функцый музычнага тэксту. Унісоннае дубліраванне меладычных галасоў і гарманічных ліній. Актаўнае дубліраванне ў розных групах аркестра з мэтай дабаўлення гукавога аб'ёму. Правядзенне мелодыі ў двух-, трох-, чатырохгалоссі.

*Тэма 6. Асаблівасці адаптацыі і пераладжэння музычнага твора з партытуры сімфанічнага аркестра для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра*

Агульныя і адрозныя рысы аркестравых груп у саставах сімфанічнага і эстрадна-сімфанічнага аркестраў. Узбуйненне фактурных элементаў, унісоны, актаўныя ўдваенні. Стварэнне рытмаформулы акампанементу. Выбар стылістыкі. Перадача тэмбраў інструментаў сімфанічнага аркестра сродкамі эстраднага ансамбля ці эстрадна-сімфанічнага аркестра.

*Тэма 7. Асаблівасці адаптацыі і пераладжэння музычнага твора з партытуры духавога аркестра для эстрадна-сімфанічнага аркестра*

Агульныя і адрозныя рысы аркестравых груп у саставах духавога і эстрадна-сімфанічнага аркестраў. Перанясенне мелодыі з груп і ад салістаў духавога аркестра для груп і салістаў эстрадна-сімфанічнага аркестра. Састаўленне формулы акампанементу ў эстрадна-сімфанічным аркестры, улічваючы асаблівасці гучання акампанементу ў духавым аркестры. Перадача тэмбраў інструментаў духавога аркестра ў эстрадна-сімфанічным аркестры.

*Тэма 8. Асаблівасці адаптацыі і пераладжэння музычнага твора з партытуры ансамбля (аркестра) некласічнага складу для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ансамблі (аркестры) некласічнага складу, ансамблі (аркестры) з удзелам этнічных інструментаў. Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычных твораў з партытуры ансамбля (аркестра) некласічнага складу для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра. Перадача тэмбраў этнічных музычных інструментаў народаў свету ў эстрадным ансамблі, эстрадна-сімфанічным аркестры. Магчымасці электронных клавішных інструментаў пры адаптацыі музычных твораў з удзелам этнічных інструментаў для выканання сродкамі эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра.

## Раздзел III. Асаблівасці работы над формай музычнага твора і падрыхтоўкі партытуры эстраднай канцэртнай мініяцюры для выканання ў эстрадна-сімфанічным аркестры

*Тэма 9. Скарачэнне асобных частак музычнага твора*

Скарачэнне («купюры») асобных частак музычнага твора. Захаванне цэласнасці музычнай формы і лагічнасці развіцця мастацкага вобраза музычнага твора. Напісанне новых пераходаў і звязак паміж раздзеламі. Пераасэнсаванне танальнага плана музычнага твора, напісанне лагічных мадуляцый для выключэння нелагічных і рэзкіх пераходаў паміж раздзеламі. Перапрацоўка фактуры музычнага твора ў сувязі з новай формай (пры неабходнасці).

*Тэма 10. Дабаўленне новых раздзелаў у музычны твор. Асаблівасці работы над распрацоўкай музычнага матэрыялу*

Дабаўленне новых раздзелаў (інтэрлюдый, эпізодаў). Дасачыненне музычнага матэрыялу. Дабаўленне імправізацый на аснове музычнага матэрыялу арыгінала. Перапрацоўка фактуры музычнага твора ў сувязі з новай формай (пры неабходнасці). Кампазіцыйныя прыёмы для развіцця музычнай формы, распрацоўка музычнага матэрыялу, вар'іраванне, імправізацыі.

*Тэма 11. Асаблівасці чаргавання і спалучэння аркестравых эпізодаў*

Прынцып чаргавання і спалучэння аркестравых эпізодаў, стылістычна абгрунтаванае чаргаванне сола, soli, аркестравых ансамбляў і tutti. Прынцып аркестравага кантрасту. Падтрымка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

партыі саліста. Суправаджэнне саліста. Стварэнне ўмоў для саліруючай партыі (стварэнне «свабоднай зоны» гучання, рэгістравы кантраст з папярэднім эпізодам, спрашчэнне аркестравай фактуры ў час гучання сола).

*Тэма 12. Асаблівасці падрыхтоўкі аркестравых партый*

Падрыхтоўка музычных партый для выканання ў аркестры, выгода для выканання партый аркестравымі выканаўцамі, выгода перагортвання старонак партый, эстэтычнае афармленне аркестравых партый і партытуры, праверка адсутнасці памылак. Выстаўленне тэмпаў, метранома. Выстаўленне дынамічных нюансаў, асаблівасцей характару музычнага твора. Указанні аўтара, аранжыроўшчыка музычнага твора, аўтара тэксту. Указанне аўтарскага права. Друкаванне (напісанне) аркестравай партытуры і музычных партый. Падрыхтоўка сола і імправізацый для непасрэдных выканаўцаў у эстрадна-сімфанічным аркестры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Падрыхтоўка партытуры для салістаў-інструменталістаў (ансамбля салістаў), салістаў-вакалістаў і эстрадна-сімфанічнага аркестра

*Тэма 13. Асаблівасці падрыхтоўкі партыі саліста-інструменталіста*

Улік тэхнічных і выразных магчымасцей непасрэдных выканаўцаў-інструменталістаў партыі сола ў аркестры. Падрыхтоўка музычнай партыі для выканання сола ў аркестры, выгода перагортвання старонак партыі, эстэтычнае афармленне аркестравай партыі саліста, праверка адсутнасці памылак. Палягчэнне (ускладненне) партыі сола ў залежнасці ад кваліфікацыі музыканта. Гарманічная сетка імправізацыі саліста.

*Тэма 14. Асаблівасці падрыхтоўкі партый для ансамбля салістаў-інструменталістаў*

Улік тэхнічных і выразных магчымасцей непасрэдных выканаўцаў партыі soli, а таксама партый ансамбляў салістаў у аркестры. Стылізацыя гучання дыксіленда, ансамбля «комба», іншых відаў ансамбляў у складзе аркестра. Асаблівасці суправа-

джэння ў стылі дыксіленд. Проціпастаўленне, спалучэнне партыі soli (ансамбля салістаў) і аркестра. Прынцып аркестравага кантрасту. Хорус.

*Тэма 15. Асаблівасці падрыхтоўкі партыі салістаў-вакалістаў*

Улік дыяпазонаў, тэхнічных і выразных магчымасцей непасрэдных выканаўцаў партыі вакалу. Транспанаванне музычнага твора ў выпадку несупадзення дыяпазонаў гучання голасу і партыі вакалу ў партытуры. Напісанне падрадковага тэксту ў партыі вакалу. Афармленне вакальнай партыі. Асаблівасці перадачы партыі вакалу ад аднаго выканаўцы іншаму. Дуэты, трыа і іншыя ансамблі салістаў.

*Тэма 16. Асаблівасці напісання партыі бэк-вакалу*

Улік дыяпазонаў, тэхнічных і выразных магчымасцей непасрэдных выканаўцаў партыі бэк-вакалу. Асаблівасці мужчынскіх і жаночых галасоў, іх спалучэнні. Аднародныя, змешаныя вакальныя ансамблі. Падтрымка партыі саліста-вакаліста. Фактурныя элементы партыі бэк-вакалу. Камбінаванае выкладанне партыі бэк-вакалу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Браславский, Д. А.* Аранжировка для эстрадных ансамблей и оркестров / Д. А. Браславский. – М. : Музыка, 1974. – 392 с.

2. *Гаранян, Г. А.* Аранжировка для эстрадных и вокально-инструментальных ансамблей / Г. А. Гаранян. – М. : Музыка, 1986. – 224 с.

3. *Гаранян, Г. А.* Основы эстрадной и джазовой аранжировки / Г. А. Гаранян. – М. : Фонд Георгия Гараняна, 2010. – 252 с.

4. *Киянов, Б. П.* Руководство по инструментовке для эстрадных оркестров и ансамблей / Б. П. Киянов, С. И. Воскресенский. – Л. : Музыка, 1978. – 182 с.

5. *Оленико*в*, К. В.* Аранжировка / К. В. Олеников. – Ростов н/Д : Феникс, 2003. – 112 с.

6. *Саульский, Ю. С.* Аранжировка для биг-бэнда: методические заметки / Ю. С. Саульский. – М. : Композитор, 2001. – 128 с.

7. *Чулаки, М. И.* Инструменты симфонического оркестра / М. И. Чулаки. – М. : Музыка, 1983. – 172 с.

*Дадатковая*

1. *Агафонников, Н. Н.* Симфоническая партитура / Н. Н. Агафонников. – Л. : Музыка, 1981. – 196 с.

2. *Банщиков, Г.* Законы функциональной инструментовки / Г. Банщиков. – СПб. : Композитор, 1999. – 240 с.

3. *Зряковский, Н. Н.* Общий курс инструментоведения / Н. Н. Зряковский. – М. : Музыка, 1976. – 480 с.

4. *Мальтер, Л.* Таблицы по инструментоведению / Л. Мальтер. – М. : Музыка, 1965. – 65 с.

5. *Модр, А.* Музыкальные инструменты / А. Модр. – М., 1959.

6. *Пистон, У.* Оркестровка : пер. с англ. / У. Пистон. – М. : Сов. композитор, 1990. – 459 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Пры складанні заданняў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» неабходна прадугледзець узрастанне іх складанасці: ад заданняў, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучаным вучэбным матэрыяле на ўзроўні пазнавання, да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўзнаўлення, і далей да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў.

Пры выкананні самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» студэнту неабходна асобную ўвагу звярнуць на дыяпазоны музычных інструментаў, іх тэхнічныя і выразныя магчымасці, асаблівасці фактуры музычных твораў.

### Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

1) тэхнічны залік;
2) залік;
3) экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

**10 балаў** ставіцца за дасканалае выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», бездакорны ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы, выдатны ўзровень культуры выканання творчых заданняў;

**9 балаў** ставіцца за выдатнае выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за высокі ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, высокі ўзровень культуры выканання творчых заданняў;

**8 балаў** ставіцца за добрае выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за дастатковы ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, сістэматызаваныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, добры ўзровень культуры выканання заданняў;

**7 балаў** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на сярэднім мастацкім узроўні, за дастатковы ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за сістэматызаваныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, добры ўзровень культуры выканання заданняў;

**6 балаў** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на здавальняючым мастацкім узроўні, за дастатковы ўзровень валодання ўсім арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за дастатковыя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб’ёме вучэбнай праграмы, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5 балаў** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на здавальняючым мастацкім узроўні, за слабы ўзровень валодання арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за недастатковыя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, сярэдні ўзровень культуры выканання заданняў;

**4 балы** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на нізкім мастацкім узроўні, за слабы ўзровень валодання арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за недастатковыя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, сярэдні ўзровень культуры выканання заданняў, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

**3 балы** ставіцца за выкананне прадстаўленых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур» на нізкім мастацкім узроўні, за нізкі ўзровень валодання арсеналам выразных і тэхнічных магчымасцей музычных інструментаў, за недастатковыя веды па пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў;

**2 балы** ставіцца за недастатковую колькасць патрабуемых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за фрагментарныя веды па пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў;

**1 бал** ставіцца за адсутнасць патрабуемых экзаменацыйных работ па дысцыпліне «Падрыхтоўка ансамблевых і аркестравых партытур», за адмову ад адказу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ПАДРЫХТОЎКА
# АНСАМБЛЕВЫХ І АРКЕСТРАВЫХ ПАРТЫТУР

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-02*
*Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60х84 1/16.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,99. Ул.-выд. арк. 0,61. Тыраж экз. Заказ

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ:

***дневная форма получения образования***

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | практ | | |
| Уводзіны | 2 | 2 | | |
| *Тэма 1.* Асаблівасці гучання ансамбля, аркестра ў параўнанні з камп'ютарнай фанаграмай | 2 | 2 | | |
| *Тэма 2.* Асаблівасці транскрыпцыі з музычнай фанаграмы. Замена музычных інструментаў пры транскрыпцыі ў адпаведнасці з кампазітарскім замыслам | 12 | 10 | 2 | вуснае апытанне, творчыя заданні, залік, экзамен |
| *Тэма 3.* Асаблівасці транскрыпцыі партый ударнай устаноўкі і перкусіі. Асаблівасці транскрыпцыі і пераапрацоўкі электронных ударных інструментаў для ўдарнай устаноўкі і перкусіі | 12 | 10 | 2 | вуснае апытанне |
| *Тэма 4.* Асаблівасці транскрыпцыі партыі фартэпіяна, гітары, бас-гітары і інш. Пераасэнсаванне і ўвядзенне ў партытуру партый музычных інструментаў | 14 | 12 | 2 | вуснае апытанне, творчыя заданні, залік, экзамен |
| *Тэма 5.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры эстраднага ансамбля для дадзенага (іншага) складу эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра | 12 | 9 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні, залік, экзамен |
| *Тэма 6.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры сімфанічнага аркестра для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра | 14 | 11 | 3 | творчыя заданні, залік, экзамен |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 7.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры духавога аркестра для эстрадна-сімфанічнага аркестра | 14 | 11 | 3 | творчыя заданні, залік, экзамен |
| *Тэма 8.* Асаблівасці адаптацыі і пералажэння музычнага твора з партытуры ансамбля (аркестра) некласічнага складу для эстраднага ансамбля, эстрадна-сімфанічнага аркестра | 14 | 11 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні, залік, экзамен |
| *Тэма 9.* Скарачэнне асобных частак музычнага твора | 10 | 7 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні |
| *Тэма 10.* Дабаўленне новых раздзелаў у музычны твор. Асаблівасці работы над распрацоўкай музычнага матэрыялу | 14 | 11 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні, залік |
| *Тэма 11.* Асаблівасці чаргавання і спалучэння аркестравых эпізодаў | 14 | 11 | 3 | вуснае апытанне |
| *Тэма 12.* Асаблівасці падрыхтоўкі аркестравых партый | 16 | 13 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні, залік, экзамен |
| *Тэма 13.* Асаблівасці падрыхтоўкі партыі саліста-інструменталіста | 16 | 13 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні |
| *Тэма 14.* Асаблівасці падрыхтоўкі партый для ансамбля салістаў-інструменталістаў | 16 | 13 | 3 | вуснае апытанне, творчыя заданні |
| *Тэма 15.* Асаблівасці падрыхтоўкі партыі салістаў-вакалістаў | 16 | 13 | 3 | вуснае апытанне, залік |
| *Тэма 16.* Асаблівасці напісання партыі бэк-вакалу | 18 | 15 | 3 | вуснае апытанне, экзамен |
| **Усяго…** | **216** | **174** | **42** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ